ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА ЎЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

ЧАЦВЕР
1989
8
ЧЭРВЕНЯ
№ 20(1613)

НА НАВУКОВАЙ ХВАЛІ

ДЫЯЛЕКТЫКА. ПЕРАБУДОВА. ЧАЛАВЕК.

16—19 мая ў Мінску праходзіла Усесаюзная навукова-практычная канферэнцыя «Дыялектыка. Перабудова. Чалавек». У ёй прынялі ўдзел больш за 200 вучоных-грамадазнаўцаў з многіх гарадоў краіны, уключаючы такія буйнейшыя навуковыя цэнтры, як Масква, Ленінград, Кіеў, Новасібірск.

Напэўна, упершыню канферэнцыя такога роду пры дапамозе публікацый у рэспубліканскім друку запрасіла ўдзельнічаць у рабоце ўсіх жадаючых. Тым самым было выражана імкненне адысці ад «кялейнасці» навуковых дыскусій, выказана гатоўнасць да дыялогу, абмеркавання розных пазіцый і думак.

На працягу ўсіх чатырох дзён работы форума грамадазнаўцаў прадметам дыскусіі былі такія актуальныя пытанні тэорыі і практыкі, як роля матэрыялістычнай дыялектыкі ў фарміраванні метадалагічнай базы перабудовы, праблема духоўнага абнаўлення сацыялізму, перспектывы радыкальнай эканамічнай рэформы, шляхі фарміравання прававой дзяржавы, існаванне навукі ў сістэме сучасных сацыяльных каштоўнасцей.

Як глыбокія і змястоўныя былі адзначаны выступленні члена-карэспандэнта АН СССР В. С. Сцёпіна, дактароў філасофскіх навук В. М. Мяжуева, М. С. Кагана, А. І. Зелянкова, кандыдата філасофскіх навук Г. С. Бацішчава, а таксама іншых удзельнікаў канферэнцыі.

Жывую, зацікаўленую размову грамадазнаўцы вялі і на чатырох арганізаваных у рамках канферэнцыі «круглых сталах», праведзеных па тэмах: «Дыялектыка развіцця сацыялізму: творчы ленінізм супраць метафізікі сталінізму», «Нацыянальная самасвядомасць і культура міжнацыянальных адносін», «Перабудова і моладзь» (на Мінскім НВА «Інтэграл»), «Практыка перабудовы ў працоўных калектывах: праблемы і супярэчнасці» (на Мінскім ВА вылічальнай тэхнікі). На дзвюх апошніх сустрэчах адбыўся дыялог прадстаўнікоў працоўных калектываў з філосафамі і эканамістамі, які выклікаў немалую цікавасць у абодвух бакоў. 17 мая прайшла сустрэча доктара філасофскіх навук, начальніка Галоўнага ўпраўлення выкладання грамадскіх навук Дзяржкамітэта СССР па народнай адукацыі В. І. Купцова са слухачамі ІПК пры БДУ імя У. І. Леніна.

Галоўны вынік канферэнцыі — высвятленне задач і перспектыў далейшага ўдасканалення работы грамадазнаўцаў і вышэйшай школы.

М. ЖБАНКОЎ,
кандыдат філасофскіх навук.

ЗНАЁМЦЕСЯ: НОВЫ ДЫРЭКТАР

Каб не стаў БДУ даўгабудам

Навукова-даследчы інстытут траўматалогіі, мединстытут, бальніца хуткай дапамогі, 9-я клінічная бальніца, школы, дзіцячыя сады, жылыя дамы... Гэтыя аб'екты адзін за адным хутка папаўнялі яго «будаўнічы» рахунак.

Не так даўно яго прозвішча ўнесена ў даведнік кіруючых работнікаў БДУ імя У. І. Леніна. Сёння наш карэспандэнт сустрэлася з *Віктарам Мацвеевічам САПЁЛКІНЫМ* — дырэктарам універсітэцкіх аб'ектаў, якія будуюцца.

...Па ўсім было відаць, што гэтыя двое даўнія і добрыя сябры. Спачатку некалькі звычайных у такім выпадку пытанняў: «Ну, дзе ты зараз?», «Як сям'я?», «А як справы ў цябе?». І незаўважна размова перайшла ў дзелавое рэчышча. «Пайшлі ў ход» словы «засаўка», «кабель», «бетон», «цэгла». І пытанне гучала адно: «Можа ведаеш, дзе дастаць?».

— Заскочу пры выпадку да цябе, пагляджу, чым багаты, што можна «пазычыць».

Я адразу абурылася яго словам, але потым, калі пазнаёмілася з маім субяседнікам бліжэй, зразумела: інакш нельга.

— На жаль, сёння сістэма забеспячэння будоўлі неабходнымі матэрыяламі не вытрымлівае ніякай крытыкі,— гаворыць В. М. Сапёлкін.— Таму і даводзіцца выкарыстоўваць асабістыя кантакты: з некім разам вучыўся, кагосьці ведаеш па сумеснай рабоце. Тэрміны будаўніцтва даволі сціслыя, таму хочашне хочаш, а вымушаны круціцца.

— Наколькі я ведаю, спадчына Вам дасталася не лепшая...

— З адным даўгабудам,— спартыўным комплексам па вуліцы Кастрычніцкай, спадзяюся, у бліжэйшы час развітаемся: плануем у чэрвені здаць першую чаргу. Неўзабаве і ўвесь комплекс увойдзе ў строй.

А вось што рабіць з НДІ ядзерных праблем? Згодна з планам, будаўніцтва яго павінна было пачацца два гады назад, а гэта не зроблена і зараз. Кіраўніцтва інстытута да сённяшняга дня ва ўсіх інстанцыях даказвае, што ніякай радыяцыйнай пагрозы гораду ўстанова несці не будзе. А час ідзе. Магчыма, хутка мы атрымаем дазвол (неабходныя паперы пакрысе збіраюцца) на будаўніцтва корпуса. Толькі ў сярэдзіне года хто возьме яго ў план? Па рашэнню Савета Міністраў сёлета на гэтым аб'екце мы павінны асвоіць 600 тысяч рублёў капіталаўкладанняў.

Карацей, марудзіць няма часу. Тым больш, што ўсялякае адхіленне ад плана пагражае зрывам канчатковых тэрмінаў будаўніцтва. А калі ўлічыць, што для Галоўмінскбуда універсітэцкі гарадок — аб'ект ці не другарадны (сёння больш спытаюць за ўзвядзенне жылля, бальніц, дзіцячых садоў), то трэба спяшацца.

— Побач з пляцоўкай, дзе пачата будаўніцтва універсітэта,— рэліктавая дубрава. Як Вы думаеце зберагчы яе?

— Месца гэта, сапраўды, унікальнае. Шкада, што да пачатку работ пра яго ніхто не ўспомніў. Помнік прыроды стаў месцам пастаяннага адпачынку жыхароў мікрараёнаў, што знаходзяцца непадалёку, частыя госці тут і студэнты. Таму дубрава забруджваецца, знішчаюцца маладыя парасткі дрэў. А яе абавязкова патрэбна захаваць, хаця б таму, што колькасць зялёных насаджэнняў вакол горада рэзка скарачаецца. Добра было б знайсці дубраве сапраўднага гаспадара і зрабіць на гэтым месцы нешта накшталт батанічнага сада. Зараз мы дамаўляемся з Саюзам архітэктараў аб праекціраванні агароджы для помніка прыроды.

Ёсць тут і яшчэ адна праблема. Побач з дубравай мы павінны былі прабурыць дзве свідравіны, якія б забяспечвалі вадой аб'екты. Адна з іх ужо была зроблена, калі аб гэтым даведалася грамадскасць, у прыватнасці, члены нефармальных аб'яднанняў. Зараз работа спынена. Думаю, свідравіны ўсё ж такі будуць. Але, ведаеце, часам крыўдна становіцца: чаму трэба сотні разоў ва ўсіх інстанцыях і проста прыватным асобам паўтараць: мы бяром ваду з сямідзесяцілятіметровай глыбіні. Гэта трэці ваданосны слой. Дубраву ж будзе «паіць» першы.

— Ідучы на гэту пасаду, Вы, безумоўна, ведалі становішча спраў. І ўсё ж выбар зроблены. Чаму?

— Па-першае, на маім рахунку ўжо ёсць універсітэцкія аб'екты. Я ў нейкай ступені валодаю «тайнамі» універсітэцкага будаўніцтва. Па-другое, захапіў яго маштаб: да 2005 года — часу ўводу ў дзеянне апошняга аб'екта — трэба асвоіць больш за 200 мільёнаў рублёў капіталаўкладанняў. Акрамя тых аб'ектаў, пра якія ішла размова вышэй, будзем узводзіць інтэрнаты, сталовыя, будынкі вучэбных карпусоў, жылыя дамы, міжвузаўскі цэнтр абслугоўвання навуковых даследаванняў, пансіянат для прафесарска-выкладчыцкага саставу, біястанцыю для вучэбнай і навукова-даследчай работы, гараж і іншыя збудаванні. Карацей, як жартуюць мае таварышы, работы хопіць да пенсіі.

— Што Вас, як дырэктара, хвалюе сёння больш за ўсё?

— Як утрымаць кадры. Сёння ідзе вельмі вялікі адток людзей з дзяржаўных прадпрыемстваў у кааператывы. Мой намеснік, з якім я працаваў раней, таксама накіраваўся ў кааператыў. І зараз не шкадуе, бо ў нас ён атрымліваў 270 рублёў у месяц, а там (пры выкананні аднаго і таго ж аб'ёма работ) — 1200 рублёў.

Праблема цякучасці кадраў стаіць надзвычай востра. Таму што ў нас нізкая матэрыяльная зацікаўленасць. Калі ва ўпраўленні — ранейшым месцы маёй работы — інжынер атрымліваў 160—170 рублёў, то тут — 140—150. Паспрабуйце знайсці спецыяліста на такія грошы. Вопытны, безумоўна, пойдзе туды, дзе больш плацяць. А школьнік, які не ведае будоўлі, нас не задавальняе. Няма тут і «чатырнаццатай» зарплаты за выслугу гадоў.

Вось і даводзіцца скарачаць штаты, каб хоць неяк матэрыяльна заахвоціць людзей — добра, што гэта зараз не забараняецца. Таму пры невялікім штаце дырэкцыі ад чатырох чалавек вымушаны сёння адмовіцца.

— Віктар Мацвеевіч, на пасадзе дырэктара Вы працуеце не так даўно — нейкія тры тыдні. Ці адчуваеце задавальненне ад сваёй работы?

— Пакуль, на жаль, адны клопаты. Але вырашыш адно пытанне, і гэта ўжо прыемна — справа паціху рухаецца наперад.

Гутарку вяла
З. АЛЯШКЕВІЧ.

ФОТА Ў НУМАР



Студэнцкаму форуму — быць! — упэўнены студэнт фізічнага факультэта Аляксандр Бандарчык.

Шмат праблем накапілася. Каму, як не выхаванаму на самакіраванні студэнту, іх вырашаць? І хоць застаўся ў Сашы толькі адзін вучэбны год, спадзяёмся ён паспее не толькі унесці прапановы, але і правесці іх у жыццё...

Фота С. ГРЫЦА.

УСЕСАЮЗНЫ СТУДЭНЦКІ

Ці быць форуму?..

Форум будзе не першым «зборам» прадстаўнікоў студэнцтва. Гісторыя студэнцкага руху ведала і злёты актывістаў будаўнічых атрадаў (апошні адбыўся ў 1983 годзе ў Алма-Аце, чарговы плануецца на чэрвень гэтага года ў Валгаградзе), і Усесаюзны злёт студэнтаў, які праходзіў у Маскве ў 1971 годзе. Тады ў Вялікім Крамлёўскім палацы было сказана нямала правільных слоў аб студэнцкіх праблемах, але пераважаў устойлівы стэрэатып «у нас усё добра, хоць і не без асобных недахопаў». Магчыма, гэта і з'явілася галоўнай прычынай таго, што амаль два дзесяцігоддзі не праводзіліся сустрэчы са студэнтамі. Паступова звужалася кола пытанняў, якія вырашаліся пры непасрэдным удзеле студэнтаў, не ўлічвалася іх думка па тых ці іншых праблемах. Студэнты ўсё больш станавіліся «гасцямі» ва ўласным доме.

Аднак апошнім часам сітуацыя ў студэнцкім асяроддзі, як і ў краіне ў цэлым, значна змянілася. Іншымі сталі і будучыя высокакваліфікаваныя спецыялісты. У большасці сваёй яны хочуць актыўна ўздзейнічаць на ўвесь працэс уласнай падрыхтоўкі, імкнуцца змяніць існуючае становішча спраў у вышэйшай школе. Таму ёсць падстава спадзявацца, што форум не ператворыцца ў месца рытуальных зваротаў да вышэйшага кіраўніцтва краіны, як гэта было раней. Мы спадзяёмся на сур'ёзную, канструктыўную размову пра

(*Заканчэнне на 3-й стар.*).

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ

БДУ сумесна с рэктаратам праводзіць конкурс ідэй, перспектыўных тэм і распрацовак. Пераможцы конкурсу будуць мець магчымасць і надалей працаваць над прадстаўленымі тэмамі на працягу двух гадоў. Фінансаванне работ будзе ажыццяўляцца ў аб'ёме 10 тысяч рублёў па гуманітарных факультэтах і такая ж сума — па прыродазнаўчых штогод. Заяўкі на ўдзел у конкурсе прымаюцца да 30 верасня.

Тэлефон для даведак — 26-57-00 (А. Ф. Сышчанка, п. 155 галоўнага корпуса). Дарэчы, атрымаць падрабязную інфармацыю вы можаце ў сябе на факультэце, калі звернецеся да старшыні савета маладых вучоных.

Т. ДОЎНАР.

КАЛІ Ў ВАС ГРОШЫ НЕ ЛІШНІЯ

і вы жадаеце стаць пераможцай, прыміце ўдзел у штогадовым конкурсе на лепшую навуковую работу. Праводзіцца ён будзе па чатырох серыях.

Серыя 1. Матэматыка, механіка, фізіка.

Серыя 2. Хімія, біялогія, геаграфія.

Серыя 3. Гісторыя, філасофія, навуковы камунізм, эканоміка, права.

Серыя 4. Філасофія, журналістыка.

Пераможцаў конкурсу чакае прэмія памерам 200 рублёў для кожнай серыі. Прадугледжаны таксама чатыры заахвочваючыя прэміі па 50 рублёў. Тэрмін падачы матэрыялаў — да 1 лістапада. Работы на конкурс прадастаўляюцца старшыням саветаў маладых вучоных факультэтаў.

САВЕТ МАЛАДЫХ ВУЧОНЫХ БДУ.

ЭКСКУРСІІ ДЛЯ ЗАМЕЖНІКАЎ

— справа звычайная. У час вучобы мы імкнёмся больш даведацца пра Савецкі Саюз, яго людзей. Нядаўна нас запрасілі да сябе ў госці дзеці, якія займаюцца ў Мінскім Палацы піянераў і школьнікаў. Для 30 студэнтаў і аспірантаў з розных кантынентаў свету, якія накіраваліся ў Палац піянераў разам з выкладчыкамі кафедры рускай мовы БДУ, гэты дзень стаў сапраўдным святам.

Школьнікі таксама былі рады сустрэчы з намі. Пасля агульнага знаёмства з работай Палаца, мы пабывалі на выстаўцы ілюстрацый, якія расказваюць аб рабоце шасці аддзелаў: тэхнічнай і мастацкай творчасці, метадычнай, масава-палітычнай і абарона-масавай работы, дэкаратыўна-прыкладной творчасці.

Вельмі ўразіла выстаўка работ, якія дзеці выканалі ўласнымі рукамі. Незвычайна прыгожа выглядаюць беларускія нацыянальныя касцюмы, вышытыя школьнікамі, розныя фантастычныя сувеніры. Асабліва зацікавіў нас настольны хакей, у які мы нават згулялі (ён таксама змайстраваны рабятамі).

А ў канцы сустрэчы мы наведалі клуб дружбы. Дзеці спявалі нам песні аб міры і дружбе, расказвалі пра сваіх сяброў за мяжой — у ГДР, Балгарыі, Польшчы. Мы таксама пакінулі дзецям свае адрасы — мы сталі сябрамі.

МАРЦІН СЕРАНЕЙ КУРГАТ,
студэнт факультэта журналістыкі.

Дзяржаўныя сімвалы Савецкай Беларусі

Гісторыя герба і флага БССР непарыўна звязана з гісторыяй утварэння першай у свеце дзяржавы рабочых і сялян, са станаўленнем яе нацыянальнай сімволікі.

Вялікая Кастрычніцкая сацыялістычная рэвалюцыя ліквідавала існуючыя ў Расіі гербы і флагі, як знешняе выражэнне старога, аджыўшага ладу. Маладой Савецкай Рэспубліцы былі неабходны зусім іншыя сімвалы, якія б адлюстроўвалі новы грамадскі і эканамічны лад, мірныя стваральныя імкненні сацыялістычнай дзяржавы, дружбу, роўнасць і братэрства савецкіх людзей.

Першым сімвалам Краіны Саветаў стаў чырвоны флаг.

Упершыню пытанне аб Дзяржаўным флагу Краіны Саветаў было разгледжана на пасяджэнні ВЦВК 8 красавіка 1918 года. Выступаючы на пасяджэнні, старшыня ВЦВК Я. М. Свярдлоў сказаў: «Гэта пытанне, якое мае, безумоўна, сусветнае значэнне... можа быць вырашана на працягу кароткага прамежка часу. Для нас, несумненна, адзіны флаг Расійскай Савецкай Рэспублікі — гэта той флаг, з якім мы ішлі на барацьбу з самадзяржаўем і буржуазіяй». У той жа дзень ВЦВК зацвердзіў Дэкрэт аб флагу РСФСР. Загадам ВЦВК ад 14 красавіка 1918 года чырвоны сцяг стаў Дзяржаўным флагам Савецкай дзяржавы і баявым сцягам яго Узброеных Сіл.

Першая Канстытуцыя краіны, зацверджаная 10 ліпеня 1918 года Пятым Усерасійскім з'ездам Саветаў, заканадаўча замацавала чырвоны флаг у якасці дзяржаўнага. У артыкуле 90 Канстытуцыі гаварылася: «гандлёвы, марскі і ваенны флаг РСФСР складаецца з палотнішча чырвонага (пунсовага) колеру, у левым вугле якога, ля дрэўка, наверсе, размешчаны залатыя літары РСФСР або надпіс Расійская Сацыялістычная Федэратыўная Савецкая Рэспубліка».

Савецкі герб пачынае сваю гісторыю з дзяржаўнай пячаці першага ў свеце ўрада рабочых і сялян. Ля вытокаў стварэння стаяў У. І. Ленін. У студзені 1918 года ён даручыў сакратару Савета Народных Камісараў М. П. Гарбунову знайсці мастака, які змог бы ўзяцца за стварэнне эмблемы Савецкай улады, і ўжо ў пачатку сакавіка 1918 года акварэльны малюнак гербавай пячаці паступіў у Саўнарком.

19 чэрвеня 1918 года, пасля адпаведнай дапрацоўкі, Савет Народных Камісараў зацвердзіў канчатковы варыянт малюнка гербавай пячаці. Ён лёг у аснову Герба РСФСР, зафіксаванага 10 ліпеня 1918 года першай Савецкай Канстытуцыяй.

Да 1919 года Віцебская, Віленская, Магілёўская і Смаленская губерніі ўваходзілі ў састаў Заходняй вобласці (з 13 верасня 1918 года — Заходняя Камуна) — адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі Савецкай Расіі. Дзяржаўныя сімвалы РСФСР былі прыняты і ўзаконены органамі Савецкай улады на гэтай тэрыторыі.

Сацыялістычная Савецкая рэспубліка Беларусі (ССРБ) была абвешчана 1 студзеня 1919 года. У Канстытуцыі БССР, прынятай 3 лютага 1919 года I Усебеларускім з'ездам Саветаў, утрымлівалася апісанне флага і герба рэспублікі: «Гандлёвы і ваенны флаг ССРБ складаецца з палотнішча чырвонага (пунсовага) колеру, у левым вугле якога ля дрэўка, наверсе, змешчаны залатыя літары С.С.Р.Б. або надпіс «Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі». «Герб С.С.Р.Б. складаецца з адлюстравання на чырвоным фоне ў промнях сонца залатых сярпа і молата, змешчаных крыж-накрыж дзяржальнамі кнізу, акружаных вянцом з калоссяў і з надпісам: а) Сацыялістычная Савецкая Рэспубліка Беларусі; б) «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!»

Такім чынам, першы флаг і Герб БССР капіравалі флаг і Герб РСФСР, адрозніваючыся ад іх толькі назвай рэспублікі. Агульнасць дзяржаўных сімвалаў РСФСР і БССР, аналогія каляровай гамы адлюстроўвалі ва ўмовах грамадзянскай вайны і інтэрвенцыі палітычнае, эканамічнае і ваеннае адзінства савецкіх рэспублік, інтэрнацыянальную аснову іх супрацоўніцтва.

27 лютага 1919 года дзве незалежныя савецкія рэспублікі — Беларуская і Літоўская аб'ядналіся ў адзіную Сацыялістычную Савецкую Рэспубліку Літвы і Беларусі з мэтай кансалідацыі палітычных, эканамічных і ваенных намаганняў у барацьбе з інтэрвенцыяй і ўнутранай контррэвалюцыяй. Гэта выклікала неабходнасць стварэння новага герба і флага. У праекце Канстытуцыі аб'яднанай рэспублікі прадугледжвалася, што ў аснову герба будзе пакладзены Герб БССР. Змены датычылі толькі надпісу: дэвіз «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» прапускаўся, назву рэспублікі меркавалася даць на пяці мовах — літоўскай, польскай, яўрэйскай, рускай і беларускай. Было таксама вырашана, што флагам Літбела стане палотнішча чырвонага колеру без усялякіх адлюстраванняў і надпісаў.

Літоўска-Беларуская ССР праіснавала нядоўга. На тэрыторыі Літвы ўсталявалася ўлада буржуазіі і памешчыкаў. У «Дэкларацыі аб абвяшчэнні незалежнасці Сацыялістычнай Савецкай Рэспублікі Беларусі», прынятай 31 ліпеня 1920 года, гаварылася пра стварэнне Беларускай ССР на асновах, устаноўленых 1 студзеня 1919 года. Герб і флаг рэспублікі былі адноўлены ў першапачатковым выглядзе, толькі замест поўнай назвы рэспублікі давалася абрэвіятура «ССРБ», а дэвіз гучаў на беларускай мове. У 1922 годзе абрэвіятура «ССРБ» была заменена на «БССР».

30 снежня 1922 года быў утвораны Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік. У Дагаворы аб утварэнні СССР, які падпісалі чатыры суверэнныя савецкія рэспублікі (РСФСР, УССР, ЗСФСР, БССР), указвалася, што «Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік мае свой флаг, герб і дзяржаўную пячаць». У Канстытуцыі СССР, зацверджанай 31 студзеня 1924 года II з'ездам Саветаў, гаварылася, што дзяржаўны герб складаецца з сярпа і молата на фоне зямнога шара, намаляванага ў праменях сонца і апаясанага калоссем, перавітым чырвонай стужкай з надпісам: «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!» — на шасці мовах — рускай, украінскай, беларускай, грузінскай, армянскай, цюрска-татарскай. На версе герба размяшчалася пяціканцовая зорка. Артыкул 71 Канстытуцыі ўтрымліваў апісанне дзяржаўнага флага: «Дзяржаўны флаг Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік складаецца з чырвонага або пунсовага палотнішча з адлюстраваннем на яго верхнім вугле ля дрэўка залатых сярпа і молата і над імі чырвонай пяціканцовай зоркі, апаясанай залатой аблямоўкай. Адносіны шырыні да даўжыні 1:2».

Да 1924 года склаліся асноўныя прынцыпы савецкай эмблематыкі. Састаўной часткай дзяржаўнага герба і флага сталі пяціканцовая чырвоная зорка, серп і молат. Зорка здаўна знаменавала надыход шчаслівага часу. У рэвалюцыйную сімволіку яна ўпершыню была ўведзена дзекабрыстамі і потым выкарыстоўвалася як сімвал рэвалюцыйнага і рабочага руху. З перамогай Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі зорка стала ўвасабляць барацьбу працы і капіталу на пяці мацерыках зямлі, адзінства пралетарыяту ва ўсім свеце, пралетарскі інтэрнацыяналізм. Яна становіцца эмблемай новай арміі, якая абараняе інтарэсы рабочых і сялян.

Серп і молат — сімвал стваральнай працы, ідэйнага і непарушнага адзінства рабочых і сялян — паявіўся вясной 1918 года. Яго аўтарам афіцыйна лічыцца маскоўскі мастак Е. І. Камзолкін. Часам аўтарства эмблемы прыпісваецца петраградскаму архітэктару Л. В. Рудневу. Напэўна, кампазіцыйнае размяшчэнне сярпа і молата належыць абодвум аўтарам, таму што адлюстраванне гэтых асобных прылад працы (здараецца, намаляваных побач) з'явілася значна раней.

Іншыя геральдычныя атрыбуты гэтак жа проста і даступна выказвалі самыя істотныя рысы Савецкай улады. Сонца — сімвал святла, агню, багацтва, жыцця — у гербавай кампазіцыі ўвасабляла сілу Савецкай дзяржавы, залаты беражок вакол зоркі — водбліск агню рэвалюцыі, каласы жыта ці пшаніцы — жыватворную сілу народа, мір і працвітанне.

Стварэнне СССР паставіла на парадак дня пытанне аб новым гербе БССР. Першы герб, на жаль, не адлюстроўваў ніякіх нацыянальных асаблівасцей рэспублікі. Да таго ж быў парушаны адзін з асноватворных законаў геральдыкі, які забараняў выкарыстанне аднаго і таго ж герба рознымі асобамі і дзяржавамі. Гэта поўнасцю адносілася і да флага.

Упершыню пытанне аб новым гербе Беларусі разгледжана на пасяджэнні Прэзідыума ЦВК БССР 22 лютага 1924 года, дзе было выказана пажаданне, каб у новым гербе знайшлі адлюстраванне асаблівасці рэспублікі і яе сувязь з Саюзам ССР.

Работа над гербам працягвалася больш за тры гады. У 1924 годзе быў праведзены рэспубліканскі конкурс на лепшы праект герба, аб'яўлены адначасова і ва ўсесаюзным маштабе. У кастрычніку таго ж года да стварэння герба быў падключаны Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт), пры якім стварылі спецыяльную камісію. У 1926 годзе ў стварэнні праекту ўдзельнічае Народны

камісарыят асветы БССР, які аб'явіў конкурс на стварэнне герба ў падведамасных яму ўстановах і арганізацыях. Прапановы на ўдзел у конкурсе былі накіраваны таксама мастацкім установам і арганізацыям РСФСР і УССР.

Мяркуючы па дакументальных даных, у ходзе работы над гербам было прадстаўлена каля ста праектаў і эскізаў гербавых кампазіцый. На жаль, графічных ці іншых ілюстрацыйных адбіткаў гэтых праектаў і эскізаў пакуль не знойдзена. Вядома толькі, што адзін з іх (аўтар Г. Я. Жмудзінскі) лёг у аснову ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга БССР — вышэйшай урадавай узнагароды рэспублікі. Па асобных апісаннях, якія захаваліся, можна меркаваць, што абавязковымі атрыбутамі герба з'яўляліся чырвоная зорка, серп і молат, асаблівасці рэспублікі спрабавалі падаць у выглядзе графічных адлюстраванняў шасцерняў, квітнеючага бульбянага бацьвіння, сасновых галінак, надпісаў і іншых эмблем.

Непасрэдны ўдзел у рабоце над праектам герба прымалі беларускія мастакі П. М. Гуткоўскі, Г. Я. Жмудзінскі, М. В. Лебедзева, В. В. Волкаў, Паўловіч і іншыя.

У абмеркаванні і разгледжанні прадстаўленых праектаў і эскізаў прымалі ўдзел вядомыя беларускія вучоныя, дзеячы навукі і культуры М. В. Доўнар-Запольскі, Б. І. Эпімах-Шыпіла, М. М. Шчакаціхін, І. І. Замоцін, О. Л. Дыла, В. Д. Друшчыц, М. В. Мялешка і іншыя.

Зараз, як ніколі, узрос інтарэс грамадскасці да гістарычнага мінулага. Паўсюдна (у тым ліку і на старонках перыядычнага друку) ідзе абмеркаванне і пераасэнсаванне самых разнастайных гістарычных фактаў і падзей, праводзяцца дыскусіі па пытаннях і праблемах, якія раней не разглядаліся, недастаткова глыбока і нават скажона трактаваліся гістарычнай навукай. Пры ўсіх станоўчых рысах гэты працэс, на наш погляд, не абыходзіцца без выдаткаў. Некаторыя, несумненна цікавыя, але далёка не самыя важныя, з'явы і факты аказваюцца ў цэнтры ўвагі, гіпертрафіруецца іх гістарычная значнасць. Іншыя, што патрабуюць самай пільнай увагі і вывучэння, нібы адышлі ў цень — незаслужана (а часам і наўмысна) падаюцца недакладна. Да іх ліку адносіцца і пытанне аб першапачатковых вытоках дзяржаўнай сімволікі Беларусі і, перш за ўсё, герба і флага рэспублікі.

Пытанні, звязаныя з гербам, неаднаразова разглядаліся на пасяджэннях СНК БССР і Прэзідыума ЦВК рэспублікі. Асабісты ўдзел у абмеркаванні праектаў прымалі А. Р. Чарвякоў, І. А. Адамовіч, А. В. Баліцкі, А. О. Сташэўскі, В. А. Нодэль і іншыя кіруючыя работнікі рэспублікі.

Такі прадстаўнічы ўдзел дазваляе гаварыць аб тым, што праекты і эскізы герба падвяргаліся ўважлівай і кваліфікаванай экспертызе.

27 снежня 1926 года СНК БССР прызнаў лепшым праект кіраўніка Беларускага мастацкага тэхнікума ў Віцебску В. В. Волкава. Ён і быў прыняты за аснову з невялікімі папраўкамі. Урад рэспублікі пастанавіў: «Выдаць мастаку Воўкаву за праект гербу, як за лепшы з пададзеных, прэмію ў суме 500 руб.».

Адначасова з гербам ішла работа над сцягам БССР. Газета «Савецкая Беларусь» 11 чэрвеня 1924 года паведаміла, што Інбелкульту даручана распрацаваць эмблему Дзяржаўнага флага БССР, якая павінна была адлюстраваць сувязь БССР з СССР. 10 снежня 1924 года СНК заслухаў пытанне «Аб зацвярджэнні эмблемы для флага БССР» і пастанавіў: «Прыняць прапанаваны праект, замяніўшы ў эмблеме сасновую галінку дубовай. Надрукаванне апісання флага адкласці да высвятлення пытання аб тым, якія дзяржаўныя флагі існуюць у УССР і ЗСФСР». Па гэтых кароткіх звестках цяжка вызначыць, што ўяўляла сабой эмблема, якія элементы знайшлі ў ёй адлюстраванне. Вядома толькі, што яна прызначалася для трафарэтных адбіткаў на флагу. Напэўна, гэта быў адзін з варыянтаў праекта герба, над якім у гэты час працавала камісія Інбелкульта.

Работа над флагам працягвалася і ў 1925—1926 гадах. У адказе Сакратарыята ЦВК БССР ад 22 лютага 1926 года на просьбу Сакратарыята ЦВК СССР тэрмінова даслаць узоры герба і сцяга Беларусі гаварылася, што «узор герба і флага БССР будзе высланы не пазней першых дзён сакавіка г. г., да якога тэрміна Інстытуту беларускай культуры прапанавана закончыць яго апрацоўку і прадставіць на зацвярджэнне Прэзідыума ЦВК БССР». Відавочна, да гэтага часу работа над флагам была закончана, таму што ў адносінах Сакратарыята ЦВК БССР у СНК БССР ад 8 чэрвеня 1926 года выказвалася просьба «пасьпяшыць з разглядам паданнага вам праэкту Гербу і сьцягу БССР».

Далейшыя звесткі аб рабоце над флагам ці яго абмеркаванні губляюцца. Невядомы таксама ніводзін яго варыянт, уключаючы і той, што знаходзіўся ў СНК. Усё гэта не дазваляе адказаць на шэраг важных пытанняў. Па тых дакументах, якія захаваліся, можна гаварыць, што ў ходзе абмеркавання герба адхіляліся праекты, у якіх чырвоная стужка-перавязь мела бакавыя белыя палоскі. Магчыма, што на варыянце флага было спалучэнне бела-чырвона-белага колеру.

5 красавіка 1927 года пачаў работу VIII Усебеларускі з'езд Саветаў, якому патрэбна было прыняць новую Канстытуцыю рэспублікі. Праект Герба БССР, выкананы В. В. Волкавым, быў выстаўлены ў зале пасяджэнняў з'езда, дзе з ім азнаёміліся дэлегаты і

госці. 11 красавіка 1927 го
з'езд аднагалосна зацве
дзіў малюнак герба, і яго а
санне было дадзена ў арт
куле 74 Канст
«Дзяржаўны ге
Сацыялістычнай Савецкай
спублікі складаецца з ад
стравання на чырвоны
не ў праменях узыхо
сонца сярпа і мол
шчаных крыж-нак
жальнамі ўніз і а
вянком, які складае
з жытніх калоссяў,
ценых канюшынай, і
з дубовай галінкі; ун
дзвюмя палавінка
знаходзіцца частка
шара. Абедзве
вянка пераплецены
лентай, на якой з
надпісы на беларус
рэйскай, рускай
скай мовах: «Пра
ўсіх краін, яднайцес
жэй — ініцыялы «Б.
На версе герба маецц
канцовая зорка. Такім
у новы герб БССР упер
ўвайшлі атрыбуты, як
люстроўваюць у графіч
сэнсавай форме суверэ
рэспублікі і яе нацыян
ныя рысы.

Канстытуцыя БССР, пры
тая 19 лютага 1937 г
Надзвычайным XII Усебе
рускім з'ездам Саветаў, у
сла змены ў апісанне Дзя
жаўнага флага БССР. У арт
куле 120 Канстытуцыі гавар
лася: «Дзяржаўны флаг Бе
рускай ССР складаецца
чырвонага палотнішча з а

люстраваннем на яго верх
вугле ля дрэўка залатых с
па і молата і над імі
чырвонай пяціканцовай зо
абрамленай залатым шл
а ўнізе сярпа і молата
тыя літары — БССР.
ны шырыні да даўжын
Флаг рэспублікі з гэта
су нясе на сабе сімва
парушнага адзінства ра
і сялян — серп і
Дакладна вызначаўся
сцяга — чырвоны (без г
вага, як гэта было р
агаворваліся яго па
Пэўным недахопам з'яў
ся тое, што флаг БССР
вельмі падобны да фл
СССР і флагаў іншых саю
ных рэспублік. Герб рэспуб
лікі заставаўся без змен,
толькі геральдычная абрэвія
тура «БССР» стала расшы
фроўвацца як Беларуская Са
вецкая Сацыялістычная Рэс
публіка.

Істотныя змены ў відарыс
Герба БССР былі ўнесены ў
1938 годзе. Яны закранул
як малюнак герба, так і надпі
сы на ім. Па рашэнню пер
шай сесіі Вярхоўнага Саве
та БССР ад 26 ліпеня 1938
года мастак В. В. Волкаў
перайначыў вянок герба: ле
вая частка вянка з
лася ра
нейшай, а ў правай дубовая
галінка была заменена калос
сямі, пераплеценымі льном.
На гэтай жа сесіі асноўнымі
мовамі Беларускай ССР былі
прызнаны беларуская і рус
кая. У сувязі з гэтым у гербе
дэвіз даваўся на гэтых дзвюх
мовах. Указам Прэзідыума
Вярхоўнага Савета БССР ад
20 лістапада 1938 года быў
зменены пераклад дэвіза
«Пралетарыі ўсіх краін, яд-

Ці быць форуму?..

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).

набалелае. Тым больш, што ідэя правядзення форума некалькі гадоў «выспявала» у ВНУ і тэхнікумах — у студэнцкім асяроддзі. Афіцыйна прапанова склікаць форум была сфармулявана на XX з'ездзе камсамола і пацверджана III пленумам ЦК ВЛКСМ у маі 1988 года.

Чым кіраваўся ЦК ВЛКСМ, Дзяржкамітэт па народнай адукацыі СССР і ВЦСПС, падтрымліваючы прапанову студэнтаў аб правядзенні форума?

Па-першае, неабходнасцю рэальна ацаніць новыя з'явы ў жыцці студэнцтва, якія выклікала перабудова.

Сёння, ва ўмовах дэмакратызацыі ўсіх сфер грамадскага жыцця, адносіны будучых спецыялістаў да навакольнага свету, як ніколі, неадназначныя. І многае ў лёсе грамадства залежыць ад таго, якія тэндэнцыі ў студэнцкім асяроддзі стануць пераважнымі.

Па-другое, форум можа выпрацаваць прапановы па паляпшэнню матэрыяльнага становішча студэнтаў, іх сацыяльнага «самаадчування», павышэнню якасці падрыхтоўкі спецыялістаў і эфектыўнасці іх выкарыстання.

Па-трэцяе, неабходна глыбока прааналізаваць студэнцкі рух у краіне, яго тэндэнцыі і перспектывы. Стварэнне асацыяцый, розных аб'яднанняў прафесійнай, экалагічнай, культурна-гістарычнай накіраванасці, палітычнай арыентацыі ставіць нямала пытанняў. Ці ёсць сэнс у стварэнні агульнасаюзнай студэнцкай арганізацыі. Якой ёй быць? Хто можа стаць яе членам, якія будуць узаемаадносіны з дзяржаўнымі органамі, камсамолам і прафсаюзамі — гэтыя праблемы і магла б абмеркаваць лістападаўская сустрэча студэнтаў.

Безумоўна, Усесаюзны студэнцкі форум адразу не вырашыць усе праблемы, не зробіць індыферэнтных студэнтаў актыўнымі, не забяспечыць заўтра ж усіх больш высокай стыпендыяй і месцамі ў інтэрнатах.

Але ён выканае пастаўленую задачу, калі прыцягне ўвагу дзяржаўных, прафсаюзных органаў, шырокай грамадскасці да ключавых праблем студэнцтва, вызначыць шляхі іх рэалізацыі, выкажацца за актыўны ўдзел самі студэнтаў у працэсе абнаўлення вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай школы, усяго грамадства.

Правядзенне форума — не самамэта, не «даніна» дэмакратызацыі грамадства. Форум уяўляецца важным, але не адзіным звяном у фарміраванні «студэнцкай», маладзёжнай палітыкі грамадства на сучасным этапе. Важнымі элементамі гэтай работы могуць быць таксама студэнцкія канферэнцыі, сустрэчы студэнтаў у партыйных, савецкіх, прафсаюзных органах, камітэтах ВЛКСМ, абмеркаванне студэнцкіх праблем на старонках сродкаў масавай інфармацыі.

Думаецца, што галоўным у правядзенні форума з'яўляецца калектыўны пошук адказу на пытанне: «Чым студэнт можа дапамагчы перабудове грамадства і чым грамадства можа дапамагчы студэнту?».

Падрыхтоўку да форума ажыццяўляе Падрыхтоўчы камітэт у складзе 92 студэнтаў, аспірантаў, камсамольскіх і прафсаюзных актывістаў, «нефармалаў», элегіраваных ад студэнцтва ўсіх саюзных рэспублік. Дапамогу Падрыхтоўчаму камітэту аказвае рабочая група ЦК ВЛКСМ, якую ўзначальвае В. Афанасьеў.

На сваім першым пасяджэнні, па ўзгадненню з арганізацыямі-заснавальнікамі, ПК прыняў рашэнне правесці Усесаюзны студэнцкі форум у лістападзе 1989 года ў Маскоўскім Палацы моладзі.

... КАЛІ БЫЦЬ, ТО ЯКІМ?

На другім пасяджэнні Падрыхтоўчым камітэтам быў вызначаны парадак выбрання дэлегатаў і яго рабочая праграма (чытайце «Беларускі універсітэт» за 11 мая гэтага года).

Пры распрацоўцы рабочай праграмы форума Падрыхтоўчы камітэт зыходзіў з таго, каб у максімальнай ступені забяспечыць дэмакратызм абмеркавання, інтарэсы розных груп студэнцтва.

Колькасць дэлегатаў ад вышэйшых навучальных устаноў складзе каля 1100. У форуме таксама прымуць удзел 360 прадстаўнікоў сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў (у адпаведнасці з распрацаванай ПК нормай прадстаўніцтва). Акрамя таго, дэлегатамі форума стануць 20 пераможцаў конкурсаў «Комсомольской правды» і «Студенческого меридиана», якія выкажуць найбольш цікавыя прапановы па перабудове народнай адукацыі, прадстаўнікі ЦК ВЛКСМ, Дзяржкамітэта па народнай адукацыі СССР, ВЦСПС. Характэрнай асаблівасцю форума будзе ўдзел у яго рабоце прадстаўнікоў шэрагу студэнцкіх арганізацый прафесійнай арыентацыі, а таксама «нефармалаў». Агульная колькасць дэлегатаў — каля 1600 чалавек.

Для ўдзелу ў форуме плануецца запрасіць прадстаўнікоў замежных студэнтаў, што вучацца ў Савецкім Саюзе, а таксама дэлегацыю Міжнароднага Саюза студэнтаў.

Зыходзячы з усяго сказанага, плануецца праводзіць форум на працягу пяці дзён.

У першы дзень мяркуецца правесці пленарнае пасяджэнне, сфарміраваць рабочыя органы, а таксама разгледзець парадак і рэгламент работы. А яшчэ — адкрыццё 17 тэматычных дыскусійных цэнтраў. Тут будуць абмяркоўвацца такія пытанні, як удзел студэнтаў у кіраванні навучальнымі ўстановамі, студэнты і ваенныя кафедры, праблемы выкладання грамадскіх навук, студэнцтва ў грамадска-палітычным жыцці краіны, перспектывы студэнцкага руху, шляхі перабудовы ў камсамольскіх і прафсаюзных арганізацыях, студэнты і рэлігія, здароўе навучэнцаў.

На другі дзень працягнуць работу тэматычныя дыскусійныя цэнтры.

Трэці дзень будзе адведзены сустрэчам дэлегатаў па прафесійных інтарэсах (педагогаў, медыкаў, будаўнікоў, машынабудаўнікоў і г. д.).

Пачнуць работу камісіі па падрыхтоўцы рашэнняў форума.

Чацвёрты дзень будзе прысвечаны сустрэчам удзельнікаў форума з кіраўнікамі міністэрстваў і ведамстваў, абмеркаванню праблем вышэйшай і сярэдняй адукацыі на пленарным пасяджэнні.

На пяты дзень будуць завершаны спрэчкі, прыняты выніковыя дакументы: рэзалюцыі, прапановы ва ўрад, Вярхоўны Савет СССР.

На працягу работы форума будуць арганізаваны сустрэчы з вядучымі вучонымі, вядомымі грамадскімі дзеячамі, адбудуцца брыфінгі і прэс-канферэнцыі.

Студэнтамі творчых ВНУ будзе падрыхтавана культурная праграма.

Трэцяе пасяджэнне Падрыхтоўчага камітэта адбылося 23—27 мая 1989 года. Абмяркоўваліся пытанні перабудовы выкладання грамадскіх навук, ільгот на транспарце.

Прапануецца аб'яднаць курсы «Палітэканомія капіталізму» і «Палітэканомія сацыялізму», а таксама «Гістарычны матэрыялізм» і «Дыялектычны матэрыялізм» у адзін курс, наблізіць тэорыю навуковага камунізму да практыкі сацыялістычнага будаўніцтва.

Унесена прапанова існуючыя льготы на транспарце: чыгуначным, водным — 50 працэнтаў з 1 кастрычніка да 15 мая, паветраным — 30 працэнтаў з 15 снежня да 15 сакавіка зрабіць круглагадовымі.

Наступнае пасяджэнне Падрыхтоўчага камітэта адбудзецца ў канцы ліпеня гэтага года.

Падрыхтоўчы камітэт прапануе для абмеркавання пытанне аб стыпендыяльным забеспячэнні.

1. Плата за працу ці сацыяльная дапамога.
2. Мінімальны памер стыпендыі. Крытэрыі яе фарміравання.
3. «Паталок» стыпендыі. Ці павінен ён быць?
4. Фарміраванне памеру стыпендыі (надбаўкі за навучанне на ваеннай кафедры, вытворчы стаж, выдатную вучобу, грамадскую работу і г. д.).
5. ВНУ і прадпрыемства — магчымасць атрымання стыпендыі з розных крыніц; ВНУ, прадпрыемства, каапératывы і інш.
6. Хто гаспадар стыпендыяльнага фонду: адміністрацыя ці студэнты?
7. Выкарыстанне фонду надбавак, прэмій, матэрыяльнай дапамогі. Яго памер.
8. Выкарыстанне магчымасцей эканоміі стыпендыяльнага фонду.
9. Падаходны падатак са стыпендыі.
10. Выплата стыпендыі з улікам раённых каэфіцыентаў.

Нам важна ведаць думку студэнтаў па ўсіх праблемах, з якімі ім даводзіцца сутыкацца.

А. КІШКЕВІЧ,
член Падрыхтоўчага камітэта Усесаюзнага студэнцкага форума, старшыня прафкома студэнтаў.

Анкета

Падрыхтоўчы камітэт гатовы разгледзець і прыняць Вашы ідэі і прапановы па правядзенню Усесаюзнага студэнцкага форума.

Будем удзячны, калі Вы адкажаце на пытанні гэтай мініанкеты і накіруеце яе на адрас: 220080, Мінск, Ленінскі праспект, 4, п. 304 (галоўны корпус), або ў рэдакцыю газеты «Беларускі універсітэт».

ВАША МЕРКАВАННЕ

1. Якія праблемы студэнцтва ў якасці самых вострых заслугоўваюць абмеркавання на форуме? .....

.....

.....

.....

.....

.....

2. Лічу, што на форуме павінны быць прыняты рашэнні: .....

.....

.....

.....

.....

.....

3. У ходзе падрыхтоўкі і ў рамках форума плануюцца сустрэчы студэнтаў з вядучымі вучонымі, вядомымі грамадскімі дзеячамі. З кім, на Вашу думку, гэтыя сустрэчы былі б найбольш цікавыя? .....

.....

.....

.....

.....

Дзякуй за адказы.

найцеся!». Раней слова «соединяйтесь» перакладалася на беларускую мову як «злучайцеся», па новаму Указу яно павінна было перакладацца «еднайцеся», што найбольш адпавядала сэнсу лозунга на беларускай мове. Яшчэ адна змена адбылася ў Гербе БССР у 1958 годзе. Яна таксама адносілася да дэвіза. Слова «соединяйтесь» стала гучаць на беларускай мове як «яднайцеся». Усе гэтыя змены знайшлі адлюстраванне ў Канстытуцыі БССР, прынятай 14 красавіка 1978 года пазачарговай дзевятай сесіяй Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Флаг БССР атрымаў сучасны выгляд пасля Вялікай Айчыннай вайны. Беларускі народ прыняў самы актыўны ўдзел у разгроме фашысцкай Германіі, і Беларуская ССР, як член-заснавальнік Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, была выйшла на міжнародную арэну, стала дзейнічаць у вырашэнні важнейшых праблем, якія хвалявалі чалавецтва. У сувязі з гэтым наспела неабходнасць відазмяніць Дзяржаўны флаг БССР, дакладней адлюстраваць у ім суверэннасць рэспублікі, яе нацыянальныя рысы. Над новым флагам працавалі вядомыя гісторыкі, юрысты, мастакі Беларусі.

25 снежня 1951 года Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР зацвердзіў новы флаг Беларускай ССР. Артыкул 168 Канстытуцыі БССР, якая дзейнічае і зараз, утрымлівае наступнае яго апісанне: «Дзяржаўны флаг Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі ўяўляе сабой палотнішча, якое складаецца з дзвюх гарызантальна размешчаных каляровых палос: верхняй чырвонага колеру, што складае дзве трэці, шырыні, і ніжняй зялёнага колеру, што складае адну трэць шырыні флага, з відарысам на верхнім левым вугле чырвонай паласы залатых серпа і молата і над імі чырвонай пяцікутнай зоркі, апраўленай залатой аблямоўкай. Ля дрэўка вертыкальна размешчаны беларускі нацыянальны арнамент белага колеру на чырвоным полі, які складае 1/9 шырыні флага. Адносіны шырыні флага да яго даўжыні — 1:2».

Новыя элементы, унесеныя ў флаг, наглядна выражаюць нацыянальныя асаблівасці рэспублікі: зялёны колер — колер надзеі, дастатку, свабоды — стаў адначасова ўвасабляць і лясныя багацці Беларусі; у арнаменце, выкананым у стылі вядомых слуцкіх паясоў, знайшла адлюстраванне мастацкая творчасць беларускага народа.

Пад гербам і флагам БССР ажыццяўляліся асноўныя этапы станаўлення і развіцця Савецкай Беларусі, якімі б цяжкімі яны ні былі ў асобныя гістарычныя перыяды. Наш герб і флаг — святыні. Духоўна бедны той, хто ўспрымае савецкія дзяржаўныя сімвалы толькі як элемент урачыстых дэманстрацый і абавязковы атрыбут свят, не ўсведамляе ўсёй глыбіні іх сапраўднага значэння і сэнсу, хто спрабуе з пазіцый ваяўнічага дылетантызму «асвятляць» айчынную гісторыю. У заключэнне хацелася б прывесці словы першага сакратара праўлення Саюза пісьменнікаў БССР Н. С. Гілевіча: «Актыўнае развіццё беларускай эканомікі, навукі, сапраўдны росквіт культуры, які выпаў на дваццатыя гады, калі нацыя не выяўляліся дэфармацыі сацыялістычнага курса, ішло пад Гербам БССР, пад флагам БССР! Дык што ж перашкаджае ажыццяўляць задачы перабудовы пад гэтым гербам, пад гэтым флагам? Нічога. Іншы падыход — або наіўнасць, або нешта яшчэ горшае, што відавочна шкодзіць справе перабудовы».

А. СТУКАНАЎ,
В. КАСМЫЛЁЎ.

ЛЕТА ПІЯНЕРСКАЕ

Першая змена для дзяцей супрацоўнікаў універсітэта ў лагеры «Ціхія світанкі», што ў Вілейскім раёне, пачалася!

А перад ад'ездам начальнік лагера Л. В. Ісайчава супакойвала бацькоў:

— Увогуле мясціны там чыстыя і дагледжаныя. Дзеці будуць жыць у драўляных і мураваных доміках. Ёсць магчымасць патэлефанаваць бацькам у горад. За здароўем іх вядзе назіранне высокакваліфікаваны ўрач.

Спадабаліся бацькам і важатыя. У спешцы даюць апошнія настаўленні дзецям праз вокны аўтобуса. Але непакоіцца матчына сэрца: наўздагон высокаму юнаку-важатаму ляціць апошняе пытанне: «А хто ім там коскі заплятаць будзе?»...

Фота С. ГРЫЦА.

МАСТАЦКАЯ ГАСЦІНАЯ

КАНЦЭРТ?!

Стрэлкі набліжаліся да 15.00. Усё менш заставалася свабодных месцаў на трыбунах стадыёна «Дынама». Мне давялося сядзець на «казырку».

Канцэрт пачаўся. Але, здаецца, мяне і ўсіх астатніх падманулі. Замест «Кіно» выйшлі абсалютна незнаёмыя доўгавалосыя хлопцы і назвалі сябе мінскай рок-групай «Фарпост».

Я з цяжкасцю разбірала словы песень і матывы мелодый. Гучная музыка, шум публікі, што патрабавала Цоя, зліваліся ў адзіны магутны роў, які нагадваў Ніагарскі вадаспад. Нарэшце, гэты дэцыбелавы шум скончыўся. Мы з палёгкай уздыхнулі.

Усе чакалі «Кіно». І вось бела-зялёны рафік, узяўшы старт ля аркі стадыёна, рушыў па бегавой дарожцы. Спыніўся ля драўлянай сцэнічнай пляцоўкі. З аўтамабіля выйшаў Віктар Цой, а за ім — Каспаран, Ціхаміраў і Гур'янаў. Гром алпадысментаў і фанатычныя воклічы прыхільнікаў сустрэлі іх.

Віктар Цой спакойна ўзяў у рукі гітару і, акампануючы сабе, заспяваў «Город по имени Солнце»...

«Ві-і-і-ця!» — пачуўся зверху вокліч, які амаль перахадзіў у рыданне. Падняўшы галаву, я ўбачыла юнае стварэнне, якое, размазваючы пацёкшую па твары тушэ, у адчаі выказвала сваё безадказнае каханне да Віктара.

Заканчвалася песня. Падрыхтаваліся да забегу на стометровую дыстанцыю да сцэны дзяўчаты з кветкамі ў руках. Апошнім акордам старт быў дадзены. Хто хутчэй? Можа, тая, у доўгім чорным плашчы? Ці яе саперніца ў какетлівым жоўтым швэдры? Але Віктар Цой, без перапынку, заспяваў наступную песню. Абедзве дзяўчыны сціпла паклалі свае кветкі на сцэну. Перамагло сяброўства...

«Группу крови» спяваў увесь стадыён. Апошнія словы песні патанулі ў навальніцы апладысментаў. Шчаслівыя прыхільнікі крычалі, свісталі, размахвалі трапіўшымі пад руку швэдрамі, хусткамі...

Песня «Аллюминиевые огурцы» была апошняй.

Але гэта быў яшчэ не канец канцэрта. Ля брамы стадыёна сабраліся самыя стойкія фанаты... Рафік з групай у салоне, імкліва набіраючы хуткасць, выехаў са стадыёна «Дынама». А за ім, быццам табун мексіканскіх мустангаў з воклічам амерыканскіх індэйцаў, несліся неўтаймаваныя прыхільнікі...

В. ЗІНОВІЧ.

НУ І НУ!

«МІШЫН»

Прыхільнікі англійскай групы «Мішын» былі вельмі здзіўлены, калі ў час канцэрта ансамбля, які праходзіў у Брыстале, на сцэну выйшла жанчына даволі сталага ўзросту і пачала ліха вытанцоўваць пад даволі агрэсіўную музыку лідэраў так званага «неагатычнага» року.

Як высветлілася потым, такім чынам вітала лідэра «Мішын»(«Місія») Уэна Хасі яго бабуля.

Расколатае люстэрка Ісціны

У крывавых языках полымя пахавальнага вогнішча ашалела мітусяцца постаці. Выконваецца рытуальны танец у гонар пахавання сародзіча. І ўсё патанае ў цемры...

Так пачынаецца дыпломны спектакль 40-га выпуску тэатральнага факультэта Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Спектакль «Дзве стралы» пастаўлены па аднайменнай аповесці А. Валодзіна.

Што такое «Дзве стралы»: прытча каменнага веку, як вызначыў п'есу сам аўтар, ці яго смелы замах на сучаснасць?

Рэжысёр-пастаноўшчык спектакля Валерый Данілавіч Анісенка ахарактарызаваў п'есу як сумна вядомую: больш за пятнаццаць гадоў яе не рэкамендавалі да пастаноўкі.

І вось на сцэне вучэбнага тэатра ідзе спектакль. На адзіным дыханні мы сочым за развіццём сюжэта, і адразу закрадваецца думка, што самае галоўнае — знайсці забойцу. Вось ён, здаецца, раскрыты: ён «вылічаны» па простай формуле — дзве стралы з савіным апярэннем, пушчаныя ў спіну Доўгаму, вельмі падобныя на стрэлы, якія носіць у сваім калчане Вушасты. У племені ведалі, што яны не былі сябрамі, хутчэй наадварот. Значыць, забойца Вушасты? Але, магчыма, некаму на руку павесіць на яго ганебны ярлык. Прычын для гэтага дастаткова. Вушасты жыве не так, як усе. Ён непадобны да іншых: незгаворлівы і нязручны чалавек. Ён не ўмее, як усе, хаваць свае пачуцці. Ды ў яго, нарэшце, і вушы не такія, як ва ўсіх: вельмі аттапыраныя, як у лятучай мышы.

Сам Вушасты яшчэ малады і не бачыў подласці і здрады. Ён не ведае, як цяжка пераконваць у сваёй невіноўнасці таго, хто, прыкрываючыся завесай справядлівасці, так марыць пазбавіцца ад Вушастага, так чакае яго смерці і ў каго сапраўды рукі ў крыві.

Вушасты верыць, што знойдзе забойцу. Для яго гэта нешта большае, чым проста боязь страціць сваё жыццё — гэта выратаванне Вышэйшай Справядлівасці. Знайсці забойцу — значыць знайсці Вышэйшую Ісціну.

Толькі адзін чалавек у племені — Галава роду — ведае, што адбылося і чым стала Ісціна: яснае і бязгрэшнае люстэрка ісціны разбілася на маленькія асколкі, і кожны ўладальнік свайго асколка лічыць сябе ўладальнікам сваёй ісціны. Іншая яму не патрэбна. Галава роду ведае, як спалохае гэтых уладальнікаў Ісціна Вушастага. Як ненавідзяць яны гэтага змагара за справядлівасць!

«Бяжы!» — просіць ён Вушастага.

Але для Вушастага Ісціна даражэй за жыццё.

Яны, уладальнікі гэтага свету, і ён, Вушасты. А паміж імі мітусіцца Даўганосік і не можа прыбіцца ні да аднаго берагу. Маленькі чалавечак, варты жалю і баязлівы. Ён ЗАЎСЁДЫ ЗГАДЖАЕЦЦА, КАЛІ З ІМ РАЗМАЎЛЯЮЦЬ ПА-ДОБРАМУ. Вушасты гаварыў з ім так, і таму ён яго сябра.Ваеначальнік і Красамоўны папрасілі яго па-добраму, і ён забіў сародзіча стралой сябра, якога раніцой павінны пакараць як вінаватага.

Цяжка было спазнаць такую Ісціну Вушастаму. Але ён, як Праметэй, смела нясе агонь людзям свайго племені.

Яны адварочваюцца ад Агню. Ды позна: полымя ўжо паспела растапіць іх васковыя маскі.

Вось яны перад намі, гэтыя пярэваратні, у сваім сапраўдным абліччы. «Красамоўны», які выкарыстоўвае сваё аратарскае майстэрства, каб выказаць Ісціну. «Ваеначальнік», які замест справядлівага бою аддае перавагу ўдару ў спіну. «Хадок», які ходзіць, як певень, па спальнях сваіх сяброў, калі тых няма дома. Удава важака, якая сваім распустам ганьбіць усіх жанчын племені.

Значыць, гэта цэлая змова — прыбраць Доўгага, які хацеў, каб у племені жылі па справядлівых законах, звалілі усю віну на Вушастага, які таксама перашкаджаў ім жыць.

Такая ўдала сплеценая інтрыга відавочна не пад сілу розумам старажытных пячорных людзей каменнага веку. Дык хто ж яны? Магчыма, гэта люстраное, крыху фантастычнае адлюстраванне Герояў Нашага Часу?

Забіты Вушасты, пакінуў племя Галава роду.

Але зярнятка ўжо кінута на сухую патрэсканую глебу. Ўстаў Даўганосік, і на яго твары няма больш звычайнага выразу страху: ён таксама хоча пайсці, каб расказаць аб тым, што здарылася, іншым плямёнам. Але нечыя здрадніцкая рука назаўсёды спыняе яго. А навокал зноў усе надзелі маскі. Якія пустыя іх вачніцы! Толькі радуюцца іх душы, як чорнае варанне, лопаючы крылямі.

Патанае іх карабель. Яму цяжка плыць без рулявога з грузам крывадушнасці, подласці і вераломства. Ці знойдзецца хто-небудзь, хто ачысціць яго трумы і падыме белы сцяг Ісціны?

А. ЖУР,
студэнтка-завочніца факультэта журналістыкі.

ТРЫБУНЫ ЎЗРУШАНЫ: НА СЦЭНЕ — ДДТ!

З ПЯТАГА НА ДЗЕСЯТАЕ

«ЕЎРОПА»

Музыканты групы «Еўропа» не толькі маладыя (23—25 гадоў), але і па-сапраўднаму таленавітыя. Іх трэці дыск «Апошні адлік» узначальвае хіт-парады ў дваццаці дзвюх краінах. Былы лідэр групы «Абба» Бені Андэрсан даў гэтым музыкантам бліскучыя характарыстыкі. А кіраўнік «Еўропы» кампазітар і вакаліст Джоі Тэмпест сказаў:

— У 80-м годзе разам з Джонам Норумам і Джонам Левенам мы пачалі рэпетыцыі ў падвале дома, дзе я жыву. Два гады работы не былі марнымі: мы сталі першымі на конкурсе маладых талентаў, які праводзіла мясцовая газета і фірма запісу. 12 студзеня 1982 года «Еўропа» атрымала галоўны прыз конкурсу, а Норум быў адзначаны як лепшы гітарыст.

Першы дыск не ўдаўся, другі — «Заўтрашнія крылы» — быў занадта «цяжкім» і «гітарным». Неўзабаве мы ўвялі ў састаў клавішніка Міку Мікаэлі: ён піша і кампазіцыі па вершах. У «Еўропе» іграюць таксама Ян Каўгланд і Кіі Марцэла, які замяніў Норума. Група іграе меладычны хард-рок, за ім — будучае, так мы мяркуем. Наша музыка мае шырокі дыяпазон слухачоў: маладыя прыходзяць на канцэрты, старыя глядзяць тэлевізар. «Усеяднасць» — гаворыце вы? Не, дэмакратычнасць.

«ДЭПЕШ МОД»

Першы дыск-гігант групы «Дэпеш мод» выйшаў у 1981 годзе. Тады ў яе састаў уваходзілі Эндру Флетчар, Дэвід Гэан, Марцін Гор, Вінск Кларк. Усе іграліі на сінтэзатарах, электрычных ударных, а таксама і на больш традыцыйных інструментах — гітарах, барабанах. Стыль групы акрэсліўся адразу — электрычны рок з відавочным танцавальным ухілам. Песні першага дыска вызначала меладычнасць, умелая аранжыроўка і... пустыя тэксты.

Трэба адзначыць, што нягледзячы на камерцыйны поспех першага дыска, група не пайшла па пратоптанай сцежцы. І хоць у музыцы ўсё ж пануе электроніка, тэксты песень ужо разлічаны больш на слухаючую публіку, чым на танцуючую: група стала закранаць сур'ёзныя тэмы. Зараз «Дэпеш мод» актыўна ўдзельнічае ў антываенным руху, выступае супраць расізму, беспрацоўя. Група падтрымала забастоўку англійскіх гарнякоў. «Дэпеш мод» — адзін з лепшых прадстаўнікоў электрычнага року.

«ПІНК ФЛОЙД»

Новы альбом легендарнай групы «Пінк Флойд», які выйшаў пад назвай «Часовае вар'яцтва» і заняў вядучае месца ва ўсіх хіт-парадах свету,— фікцыя. Так лічыць не хто-небудзь, а стваральнік і духоўны лідэр калектыву бас-гітарыст Уотэрс Гловэр.

Выпускнік Кембрыджа з дыпломам архітэктара (Уотэрсу зараз 43 гады) — ён ганарыцца тым, што за дваццацігадовую гісторыю групы яе некамерцыйная музыка заваявала поспех ва ўсім свеце. Але зараз гэта ў поўным сэнсе слова гісторыя, бо калектыў распаўся. Тым большае раздражненне выклікалі ў Уотэрса спробы трох астатніх членаў «Пінк Флойда» — Гілмара, Райта, Мэйсана — вярнуць жыццё легендзе.

— Калі б Джордж Харысан і Рынга Стар выступілі пад маркай «Бітлз», цяжка было б прыдумаць відовішча горшае,— гаворыць ён у інтэрв'ю часопісу «Рок экспрэс» — Цэлае пакаленне, безумоўна, раскупіла б білеты, нават не думаючы, што некалі жыў Джон Ленан. А без яго ж група не група. Калі я не іграю ў «Пінк Флойдзе» — гэта не «Пінк Флойд». Карыстацца назвай групы, думаючы пра грошы, гэта ж соромна.

Падрыхтавала
Лэйла БАЙРАМАВА.

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Цана 2 кап.
Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
8 чэрвеня.
Зак. 1626
Т. 2000 экз.

220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 74-75.
ТЭЛЕФОН 20-68-27.

Рэдактар
М. Г. ЗАГОРСКАЯ.